**МЯДЗВЕДСКІ** Яўген Нікандравіч (н. 25.12.1918, г. Віцебск), бел. вучоны ў галіне отарыналарынгалогіі. Канд. мед. н. (1966). Засл. ўрач Беларусі (1968). Засл. работнік вышэйшай школы (1978). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1941), у 1954—90 працаваў у ім (у 1965—79 рэктар). Навук. працы па абязбольванні пры аперацыях на верхніх дыхальных шляхах і вухе, эпідэміялогіі злаякасных новаўтварэнняў, прафілактыцы ангін, хранічнага танзіліту і інш.

*Тв.:* Научно-исследовательская работа студентов. Мн., 1989 (у сааўт.).